*Настаўнік беларускай мовы і літаратуры*
*ДУА “Гімназія г.Быхава”*
*Дзяменцій Людміла Васільеўна*

**Шаноўныя старшакласнікі!**

Штогод на ЦТ правяраецца ўзровень засваення вашых ведаў па тэме “Лічэбнік” (заданне А11). З урокаў беларускай мовы вы добра ведаеце, што лічэбнік – гэта самастойная часціна мовы, якая абазначае колькасць або парадак прадметаў пры лічэнні: *сем вучняў – сёмы вучань – сямёра вучняў*.

Прапаную вам заданні, накіраваныя на ўдасканаленне і паглыбленне ведаў па раздзеле “Лічэбнік”. Спачатку ўзгадаем тэарэтычныя палажэнні (Памятка 1), а потом замацуйце гэта на практыцы, выканаўшы прапанаваны тэст і ,безумоўна, тэставыя заданні са зборнікаў ЦТ за мінулыя гады.

1. **Разрады лічэбнікаў па значэнні.**




2. **Як змяніць разрад лічэбнікаў?**

| Кольсныя | Парадкавыя |
|---|---|
| **колькі?** | **які? каторы?** |
| се**м** | сёмы, сёмая |
| восе**м** | вос**ь**мы, вос**ь**мая |
| тры**цц**аць пяц**ь** | тры**цц**аць пяты |

*Заданне на замацаванне. Запоўніце табліцу.*

| **Колькасныя** | **Парадкавыя** | |
|---|---|---|
| | **Н.скл.** | **Д.скл., м.род** |
| тры | | |
| восем | | |
| пяць | | |
| чатыры | | |
| два | | |
| шэсць | | |

**Адказы:**

| **Колькасныя** | **Парадкавыя** | |
|---|---|---|
| | **Н.скл.** | **Д.скл., м.род** |
| тры | трэ**ц**і | трэ**ц**яму |
| восем | вос**ь**мы | вос**ь**маму |
| пяць | пяты | пятаму |
| чатыры | ча**цв**ёрты | ча**цв**ёртаму |
| два | другі | другому |
| шэсць | ш**о**сты | ш**о**стаму |

### 3. З якімі назоўнікамі ўжываюцца зборныя лічэбнікі?

| З якімі назоўнікамі ўжываюцца зборныя лічэбнікі? | |
|---|---|
| Двое, трое, чацвёра, пяцёра, шасцёра, сямёра, васьмёра, дзявяцера, дзясяцера. | Назвы асоб мужчынскага полу: *двое салдат*; |
| | Назвы маладых істот: *трое шчанят*; |
| | Множналікавыя назоўнікі: *чацвёра нажніц*; |
| | З назоўнікамі *коні, людзі, гусі, свінні*; |
| | З асабовымі займеннікамі: *нас было пяцёра*; |
| | З прыметнікамі, якія перайшлі ў назоўнікі. |

*Заданне на замацаванне. Адзначце словазлучэнні, у якіх лічэбнік двое ўжыты правільна:*

1) двое настаўнікаў;
2) двое сясцёр;
3) двое планшэтаў;
4) двое грабляў;
5) двое спадніц.

Адказы: 1,4.

### 4. Як пішуцца дробавыя лічэбнікі?

3 /числитель/ - лічнік
5 /знаменатель/ - назоўнік

**Дробавыя лічэбнікі**

**2, 3, 4 + лічэбнік у назоўным скл. мн. л.** -ія (-ыя)

**5,6 і г.д. + лічэбнік у родным скл. мн.л.** -ых

***две трэція, чатыры сёмыя***

***пяць шостых, восем дзявятых***

*Заданне на замацаванне. Запішыце лікі словамі*

$\frac{3}{5}$; $\frac{7}{8}$; $\frac{4}{5}$; $\frac{5}{8}$; $\frac{3}{8}$; $\frac{3}{4}$; $\frac{2}{3}$; $6\frac{3}{5}$; $\frac{3}{8}$.

Адказы:

$\frac{3}{5}$ - тры пятыя

$\frac{7}{8}$ - сем восьмых
$\frac{4}{5}$ - чатыры пятыя
$\frac{5}{8}$ - пяць восьмых
$\frac{3}{8}$ - тры восьмыя
$\frac{3}{4}$ - тры чацвёртыя
$\frac{2}{3}$ - дзве трэціі
6 $\frac{3}{5}$ - шэсць цэлых тры пятыя
$\frac{3}{8}$ - тры восьмыя

5. **Як пішуцца колькасныя лічэбнікі?**
















**ТЭСТ**

**ДЛЯ ЗАМАЦАВАННЯ**